# ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ КРАЯЗНАЎЧЫХ ПРАЕКТАЎ: ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ Ў СУЧАСНЫМ ГРАМАДСТВЕ

***А.М. Кавалевіч***
*Камянецкі раён, ДУА «Воўчынская сярэдняя школа"»*

Духоўна-маральнае і грамадзянска-патрыятычнае выхаванне ў школах адыгрываюць найважнейшую ролю ў фарміраванні асобы навучэнца, яго светапогляду і сацыяльных паводзін. Гэтыя два напрамкі выхавання ўзаемазвязаны і дапаўняюць адзін аднаго, спрыяючы фарміраванню грамадзяніна, які ўсведамляе свае правы і абавязкі, а таксама разумее сваю сувязь з культурай і гісторыяй сваёй краіны. Адбываецца фарміраванне маральных якасцей, гэта значыць, развіццё ўменні адрозніваць дабро ад зла, фарміраванне крытычнага мыслення і адказнасці за свае ўчынкі. Значным з'яўляецца развіццё эмацыйнага інтэлекту - уменню суперажываць, узаемадзейнічаць з іншымі людзьмі і будаваць адносіны на аснове даверу і ўзаемаразумення.

Хрысціянскія каштоўнасці могуць адыгрываць значную ролю ў сучасным адукацыйным працэсе, прыўносячы маральныя арыенціры і этычныя нормы, якія садзейнічаюць усебаковаму развіццю асобы. Ёсць шмат аспектаў, у якіх хрысціянскія каштоўнасці могуць быць інтэграваныя ў адукацыю. Напрыклад сумленнасць і справядлівасць, таму што для праваслаўнае вучэнне падкрэслівае важнасць сумленнасці, адказнасці і справядлівасці, што спрыяе стварэнню этычна арыентаванай адукацыйнай прасторы. Заахвочвае уаркв і імкненне да ведаў: хрысціянства шануе інтэлект і імкненне да новага, што можа заахвочваць вучняў развіваць крытычнае мысленне і актыўна ўдзельнічаць у навучальным працэсе.

Метады і падыходы да рэалізацыі гэтых напрамкаў могуць быць розныя: інтэграцыя ў навучальны працэс, гурткі і секцыі, партнёрства з бацькамі і грамадствам, а таксама праектная дзейнасць. Праектная дзейнасць па гісторыі ў школе - гэта эфектыўны метад навучання, які спрыяе больш глыбокаму разуменню гістарычных падзей, развіцця крытычнага мыслення і даследчых навыкаў у вучняў.

Крос-дысцыплінарныя праекты па гісторыі, накіраваныя на духоўна-маральнае выхаванне, могуць уключаць у сябе некалькі ключавых мэт: усведамленне значнасці гістарычных падзей і асоб дапамагае развіць пачуццё гонару за сваю культуру і краіну, а таксама павагу да мінулага; аналіз гістарычных падзей з розных пунктаў гледжання спрыяе фармаванню навыкаў крытычнага мыслення і здольнасці разглядаць праблемы пад рознымі кутамі; вывучэнне розных культур і гісторый народаў садзейнічае фарміраванню павагі да разнастайнасці і разумення сацыяльных канфліктаў; разгляд этычных пытанняў і маральных дылем у гістарычным кантэксце дапамагае выпрацаваць у вучняў уласныя маральныя арыентацыі і каштоўнасныя ўстаноўкі.

Крос-дысцыплінарныя праекты часта ўключаюць элементы мастацтва, літаратуры, што дазваляе навучэнцам праявіць сваю крэатыўнасць і рэалізаваць свае ідэі ў розных формах. Напрыклад, праект па гісторыі на аснове старых фатаздымкаў цэркваў можа мець некалькі мэт, якія дапамогуць глыбокаму разуменню культурнага і гістарычнага кантэксту прапанаваных матэрыялаў. Гэта збор і каталагізацыя старых фатаграфій цэркваў як спосаб захаваць гістарычныя сведчанні і павысіць дасведчанасць аб культурнай спадчыне. Такога кшталту каталагізацыя магчыма пры дапамозе медыяпрадуктаў. Даследаванне архітэктурных стыляў магчыма праз аналіз фатаграфій, а таксама выяўленне змены гэтых стыляў з цягам часу. Праз параўнальны аналіз можна ажыццявіць параўнанне старых і сучасных фатаграфій адных і тых жа аб'ектаў для вывучэння змен у асяроддзі і ў саміх будынках. Вялікую ўвагу можна надаць лакальнай гісторыі, даследаваць сувязі царквы з ключавымі падзеямі, якія адбываліся ў рэгіёне, і з гістарычнымі асобамі. Немалаважный з'яўляецца папулярызацыя гістарычнай спадчыны: прыцягненне ўвагі грамадскасці да гісторыі мясцовых цэркваў і іх значэння для культуры і традыцый.

Прыкладам такой дзейнасці будзе наступнае даледаванне: фатаграфіі Яна Балзункевіча як адлюстраванне трансфармацыі беларускага хрысціянскага храма.

Гісторыя фатаграфіі ў Беларусі налічвае больш за сто гадоў і праходзіць праз некалькі ключавых этапаў, звязаных з развіццём тэхналогій, культурных змен і сацыяльна-эканамічных умоў.

Фатаграфія ў Беларусі пачала развівацца ў пачатку XX стагоддзя. У гэты перыяд з'явіліся першыя фотастудыі, і фатаграфія стала даступнай для шырокай аўдыторыі. Фатографы, як правіла, працавалі ў гарадах, і іх паслугі карысталіся папулярнасцю ў заможнага класа.

Фатаграфія ў Беларусі стала важным інструментам самавыяўлення і сацыяльнага каментара, адлюстроўваючы як гістарычныя падзеі, так і паўсядзённае жыццё людзей. Фатаграфія ў Беларусі ў пачатку XX стагоддзя праходзіла цікавы і дынамічны этап свайго развіцця. У другой палове XIX ст. пачатку XX ст. у Беларусі з'яўляецца шмат імёнаў сапраўдных майстроў-фатографаў: Люцыян Крашэўскі, Антон Прушынскі, Яўстах Бенедыкт Козел-Паклеўскі, Тэафіл Барэці, Менахем Фішман, Ян Булгак, Соф'я Хамянтоўская.

Важнай крыніцай захоўвання памяці з'яўляуцца творчасць фатографа-краязнаўцы Яна Балзункевіча, які зафіксафаў на працягу 1905-1914 гг. хрысціянскія храмы Беларусі.

У Беларусі ёсць толькі адно друкаванае выданне рэпрадукцый Балзункевіча. Гэта кніга «Хрысціянскія храмы Беларусі на фотаздымках Яна Балзункевіча. Пачатак XX стагоддзя». Надрукаваны альбом у 2001 годзе выдавецтвам «Ураджай» дзякуючы прыцы ўкладальнікаў Кулагіна Анатолія Мікалаевіча і Герасімовіча Уладзіміра Анатольевіча. Сабраныя там фотаздымкі былі разгледзены намі як візуальная гістарычная крыніца.

Усяго ў альбоме размешчана 165 здымкаў хрысціянскіх храмаў. Тэрытарыяльна - гэта паўночны захад сучаснай Беларусі. Пераважна фотаздымкі зроблены на тэрыторыі Гродзенскай, Мінскай і Віцебскай вобласцяў і прадстаўлены каталіцкімі касцёламі і праваслаўнымі храмамі. Нажаль цэркваў з майго раёна мы не знайшлі сярод фотаздымкаў Яна Балзункевіча.

На шматлікіх здымках фатографа раскрываецца шырокая панарама нацыянальнай хрысціянскай архітэктурнай спадчыны Беларусі - манументальныя цэрквы, пабудаваныя ў глыбокай старажытнасці, напрыклад Барыса-Глебская царква ў Навагрудку. Прыклады старажытнарускага стылю - Свята-Барыса-Глебская царква ў Гродне. Ілюстраваная фотакамерай архітэктурная гістарычная спадчына падкрэслена вышыннымі вежамі над радавой вясковай драўлянай забудовай. Гіганцкія нават для гарадскога маштабу храмы маюцца ў многіх беларускіх мястэчках і нават вёсках. Дастаткова глянуць на фатаграфіі храмаў у Лужках Шаркаўшчынскага раёна, Беразавеччы Глыбоцкага раёна, Грынявічах Свіслацкага раёна.

Але асабліва каштоўнымі з'яўляюцца фатаздымкі Балзункевіча не захаваўшыхся архітэктурных помнікаў. Такіх цэркваў шмат. Калі звяртацца да выдання фотоздымкаў, то пятая частка храмаў, фота якіх там надрукаваны - не захаваліся да нашага часу. Але, дзякуючы здымкам Балзункевіча, вяртаюцца ў скарбніцу нацыянальнай гісторыка-архітэктурнай спадчыны страчаныя ў ліхалеццях XX ст. храмы ў Беразавеччы, Беразіно Мінскага раёна, Бродаўцы Барысаўскага раёна, Вяляцічах Барысаўскага раёна, Гродне. Фатаграфіі Балзункевіча ўзбагацілі нашы ўяўленні аб храмах у Залессі Глыбоцкага раёна, Радзівонішках Лідскага раёна, Солах, Хатаевічах і ў іншых паселішчах Беларусі.

Фатограф-краязнаўца не абышоў увагай пабудовы менш рэпрэзентатыўныя - невялікія вясковыя драўляныя храмы, культавую пры- належнасць якіх часам паказвала толькі макаўка ці крыж над гонтавым дахам. Дзякуючы гэтаму мы маем магчымасць папоўніць нашы веды аб найбольш ранімай і недаўгавечнай вобласці архітэктуры — народным драўляным дойлідстве. Захоплены краязнаўца знаёміць нас са страчанымі драўлянымі храмамі ў Далматаўшчыне Карэліцкага раён, Лошніцы і Мсціжы Барысаўскага раёна, Прылепах Смалявіцкага раёна, Самахвалавічах Мінскага раёна і іншых.

Фотаальбомы Балзункевіча дазваляюць уявіць выгляд многіх хрысціянскіх храмаў пачатаку XX ст. і асэнсаваць тыя змены, якія яны спазналі. Гэта культавыя помнікі ў Барунах, Барысаве, Глыбокім, Самуйлавічах Мастоўскага раёна, Станькаве Дзяржынскага раёна і іншыя. Надзвычайна непазнавальнымі на фоне фатаграфій Балзункевіча паўстаюць перад намі храмы ў Заслаўі і Сталовічах Баранавіцкага раёна, якія, аказваецца, былі ўвенчаны маляўнічым пяцікупаллем. Неацэнная важнасць гэтага фотаархіва ў рэстаўрацыйнай практыцы рэспублікі, якая набыла шырокі размах на рубяжы тысячагоддзяў на дзяржаўным і канфесійным узроўні.

Фіксуючы творы храмавага дойлідства, Балзункевіч перадае не толькі статычную прыгажосць архітэктуры, але і жывы яе прыродны і сацыяльны антураж. Не думаю, што ён спецыяльна расстаўляў вяскоўцаў каля храма для з'ёмкі. З прыездам фатографа інстынктыўна збягалася ўся вёска — звычайныя людзі з дапытлівасцю «камянелі» перад камерай ва ўрачыстай падцягнутай позе, жадаючы таксама трапіць у аб'ектыў. Сярод персанажаў гэтых ілюстрацый — гарадавы ці прыстаў у парадной позе з рукой на шашцы, мужыкі і жанчыны, якія пакінулі па выпадку на імгненне бясконцую сялянскую працу, гуллівыя дзеткі і ўвесь антураж таго далёкага ад нас жыцця.

Такім чынам, духоўна-маральнае і грамадзянска-патрыятычнае выхаванне ў школах з'яўляецца важнай асновай для фармавання гарманічна развітага чалавека, гатовага актыўна ўдзельнічаць у жыцці грамадства і несці адказнасць за яго будучыню. Праектная дзейнасць па гісторыі можа стварыць асяроддзе для актыўнага навучання, развіваючы пры гэтым разнастайныя навыкі ў навучэнцаў, у тым ліку крытычнае мысленне, камунікацыю і крэатыўнасць. Усё разам гэта дапамагае не толькі паглыбіць веды аб гісторыі, але і садзейнічаюць усебаковаму выхаванню асобы, гатовай да жыцця ў складаным, разнастайным свеце.